УДК 821.161.3“19”

**А. І. Бельскі** (Мінск)

# ПЯТРО ВАСЮЧЭНКА ЯК ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

Талент Пятра Васючэнкі living рознабаковы і шматгранны: літаратуразнавец, крытык, празаік, эсэіст, драматург, дзіцячы пісьменнік, педагог. Ён запомніўся як цікавы суразмоўнік, глыбокі аналітык, эрудыт, бліскучы інтэлектуал. А яшчэ Пятро Васільевіч быў вялікі працаўнік-руплівец, нястомны шукальнік новага і адметнага, нацыянальны інтэлігент, па-сапраўднаму адданы беларушчыне, і разам з тым гэта быў досыць сціплы чалавек. Пятро Васючэнка – выбітная творчая асоба, яго навуковая і літаратурна-мастацкая спадчына вымагае цэласнага вывучэння і асобнага грунтоўнага даследавання. Кожны аспект творчасці Пятра Васючэнкі, безумоўна, заслугоўвае належнай даследчыцкай увагі і асэнсавання.

Нават пры сціслым аглядзе навуковых набыткаў, літаратурна-крытычнага плёну П. Васючэнкі надзвычай прыкметна вылучаецца яго творчы наробак у даследаванні беларускай нацыянальнай драматургіі. Пасля таго як малады на той час аўтар дэбютаваў у друку як рэцэнзент-крытык на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» (1979, 25 мая) і выступіў з артыкуламі пра беларускую прозу на тэму вайны, ён пераключыў сваю ўвагу на сучасную драматургічную творчасць. Вынікам яго навукова-творчых зацікаўленняў стала кніга «Драматургія і час» (1991).

Гэта манаграфія створана і выдадзена ў той час, калі П. Васючэнка працаваў у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі. Ён, выпускнік аспірантуры гэтага навуковага інстытута, прадстаўляў акадэмічную літаратуразнаўчую школу, яе новае маладое пакаленне. Прэзентаваў годна, прафесійна, досыць яскрава: было відавочна, што аўтар манаграфіі – удумлівы і дастаткова кампетэнтны даследчык беларускай драматургіі. Ён дэманстраваў арыгінальнасць меркаванняў, назіранняў і ацэнак. Безумоўна, паглыбленае вывучэнне тэхналогіі і паэтыкі п’ес спрыяла назапашванню ўласнага творчага досведу Васючэнкі-драматурга, які ў хуткім часе выступіў як аўтар твораў для сцэны і тэатра, а потым выдаў зборнік п’ес «Маленькі збраяносец» (1999). «Драматургія і час» – не зусім тыповае акадэмічнае даследаванне з яго строгасцю навуковага выкладу, стылістычнай аднароднасцю і нейтральнасцю. Існуюць акадэмічны канон, акадэмічны стыль, з арыентацыяй на іх і ствараўся маладым даследчыкам літаратуразнаўчы тэкст. Манаграфія кампазіцыйна вытрыманая, апрача ўводзінаў і заключэння, яе структуру складаюць тры раздзелы: «Драма: ад жыццёвай праблемы – да жыцця п’есы», «Камедыя: абнаўленне праблематыкі і мастацкага арсеналу», «Гістарычная драма: у пошуку героя і нацыянальнага характару». Ужо самі назвы-фармулёўкі яскрава сведчаць пра аўтарскі наратыў і стыль, гэта па сутнасці тэзы з актуалізацыяй даследчай стратэгіі і адпаведнай праекцыяй на праблемна-кантэкстуальны разгляд літаратурнага матэрыялу. Мяркуючы па загалоўках, нельга не адчуць прафесійную журналісцкую вывучку П. Васючэнкі. Дарэчы, факультэт журналістыкі БДУ ён скончыў у 1981 годзе. Трымаючыся акадэмічнага дыскурсу, П. Васючэнка, на наш погляд, меў на ўвазе літаратуразнаўчыя ўзоры тэкстаў такіх выдатных даследчыкаў, як Алесь Адамовіч, Віктар Каваленка, Іван Навуменка і інш. Бо літаратурная навука, апрача іншага, гэта жывы працэс спасціжэння свету мастацкай

творчасці. П. Васючэнка менш за ўсё імкнуўся да «сухіх» акадэмічных разваг, ён дэманстраваў эўрыстычна-дыялагічны, праблемна-пошукавы характар даследчыцкай думкі. Яго кніга – разважлівая, інтэлектуальна насычаная гутарка-размова з чытачамі пра сучасную беларускую драматургію, яе набыткі, навацыі і пошукі, а таксама творчыя няўдачы, крызісныя моманты. Гэта гутарка, можна сказаць, эксклюзіўная, бо дасведчаны спецыяліст-прафесіянал у галіне драматургіі – рэдкі, па-свойму ўнікальны. Пачынаецца аўтарскі аповед з пытання, звернутага да рэцыпіентаў навукова-літаратуразнаўчага тэксту «Што такое сучасная п’еса?» [3, с. 3]. Здавалася б, пытанне не такое і складанае, адказ на яго, як кажуць, ляжыць на паверхні. Зрэшты, П. Васючэнка адразу прапануе ўласную трактоўку: «П’еса, актуальная сваёй праблематыкай і зместам, палемічна завостраная, напоўненая балючымі пытаннямі, трывогамі і надзеямі свайго часу, – такі адразу напрошваецца адказ, хаця ён і не вычарпальны» [3, с. 3]. Безумоўна, даследчык удакладняе, угрунтоўвае гэта паняцце, прапаноўвае «гіпотэзу аб ускладненасці мастацкага часу ў п’есе, якая ўсё часцей спалучае ў сваім дзеянні некалькі часавых пластоў» [3, с. 4]. Аналіз драматургічнага працэсу ўяўляе сабой аўтарскую аналітыку, уключае элементы крытыкі, палемікі. Так, акрэсліваючы тэндэнцыі развіцця жанру камедыі, П. Васючэнка робіць трапныя назіранні і высновы: «Смех не толькі ўдзельнічае ў мысленні вобразамі, ён прыцягваецца да асэнсавання канкрэтных жыццёвых праблем. У нашай камедыяграфіі трывала замацавалася жанравая разнавіднасць, якую можна вызначыць як камедыя-даследаванне, камедыя-эксперымент… Зразумела, каб гэта форма камедыі не ператварылася ў свайго роду стэрэатып, важна пашыраць не толькі кола праблем, што натхнялі б творцаў на роздум, але і сам камедыйны арсенал. Смех па-ранейшаму патрабуе якаснага абнаўлення» [3, с. 102]. П. Васючэнка разгледзеў самыя апошнія ў творчым даробку драматургаў і новыя на той час п’есы К. Крапівы, А. Макаёнка, У. Караткевіча, А. Петрашкевіча, А. Дзялендзіка, М. Матукоўскага, І. Чыгрынава, А. Дударава і інш., прытым эстэтычныя пошукі беларускіх аўтараў, іх драматургічныя творы асэнсоўваюцца даследчыкам у гісторыка-параўнальным літаратурным кантэксце. Заўважаецца тое, наколькі арганічна і глыбока ён быў падключаны да класічнага мастацкага вопыту, наколькі чуйна рэагаваў на новыя тэндэнцыі, творчыя памкненні і з усёй страснасцю прагнуў сярод новых аўтараў «знайсці Драматурга», пабачыць, як нараджаецца і ўзвышаецца сваёй творчасцю «Асоба Драматурга» [3, с. 143].

Наступнай значнай і, можна сказаць, этапнай працай у беларускім літаратуразнаўстве канца ХХ ст. стала кніга-даследаванне П. Васючэнкі «Драматургічная спадчына Янкі Купалы» (1994). Яна мае падзагаловак, які красамоўна падкрэслівае абраны дыскурс: «Вопыт сучаснага прачытання». Сапраўды, аўтар прапанаваў сучаснае, а лепш сказаць, новае арыгінальнае прачытанне творчасці Купалы-драматурга. Ён пачынае свае развагі з актуалізацыі важных пытанняў метадалагічнага і гісторыка-літаратурнага характару: «Як сёння вывучаць Купалу? Як пазбавіцца ад догмаў, скажэнняў, якімі аблытана ранейшая гісторыя літаратуры, у тым ліку і купалазнаўства?» [2, с. 3]. П. Васючэнка адразу асвятляе шэраг прынцыпова важных момантаў у разуменні асобы Янкі Купалы, яго светапогляду, фармулюе або тэзісна пазначае плённыя падыходы да асэнсавання драматургічнай спадчыны нацыянальнага класіка. Раздзелы манаграфіі «Містэрыя (“Адвечная песня”)», «Трагедыя (“Сон на кургане”)», «Камедыя (“Паўлінка”, “Прымакі”)», «Драма (“Раскіданае гняздо”)», «Трагікамедыя

(“Тутэйшыя”)», хоць у першую чаргу маркіруюць жанравую прыналежнасць тэкставых структур, насамрэч з’яўляюцца грунтоўным асэнсаваннем паэтыкі, мастацка-эстэтычнай спецыфікі драматычных твораў паводле іх ідэйнай і змястоўна-падтэкставай напоўненасці. Інакш кажучы, аўтар манаграфіі выйшаў на глыбіню ў спасціжэнні загадкавых таямніц, складанага, часам супярэчлівага, мастацкага свету Янкі Купалы, зрабіў зрэзы вобразна-сімвалічнага мыслення творцы, раскрыў яго філасофска-аксіялагічныя пошукі. Кніга П. Васючэнкі стала сапраўдным адкрыццём Янкі Купалы ў кантэксце сімвалізму з пазіцый эстэтыкі і філасофіі гэтага метаду, абранага паэтам і драматургам пры мастацкім мадэляванні свету. Дарэчы, на сувязі творчасці беларускіх пісьменнікаў пачатку XX ст. з еўрапейскім сімвалізмам звярталі ўвагу і некаторыя іншыя даследчыкі, да прыкладу, Л. Тарасюк, аднак менавіта П. Васючэнка найбольш грунтоўна і ўсебакова разгледзеў сімвалісцкую паэтыку Янкі Купалы, пры гэтым расчытаў глыбінныя, часам алегарычныя і зашыфраваныя аўтарскія сэнсы, вобразы-сімвалы, вылучыў створаныя мастаком мадэлі чалавечага быцця-існавання, выявіў нацыянальна адметнае і ўніверсальнае ў семантыцы драматургічных тэкстаў. П. Васючэнка цалкам правамерна праводзіць паралелі з польскім і рускім сімвалізмам, стварае пераўнальна-супастаўляльны кантэкст, які ў манаграфіі рэпрэзентаваны найперш імёнамі С. Пшыбышэўскага, С. Выспянскага, Л. Андрэева, прыкметна пашыраецца за кошт сусветна вядомых драматургаў і пісьменнікаў: Сафокл, У. Шэкспір, Г. Ібсэн, А. Міцкевіч і інш. Разгорнуты ў тыпалагічным плане пералік імёнаў аўтар даследавання падае ў раздзеле «Гармонія разладу (Замест заключэння)» [2, с. 170]. Галоўнае, у выніку выяўленых літаратурных аналогій і паралеляў, сыходжанняў і адрозненняў П. Васючэнка раскрыў спецыфіку купалаўскага, шырэй – беларускага – інварыянту сімвалізму.

Несумненная каштоўнасць арыгінальных думак, інтэрпрэтацый, суб’ектыўных назіранняў і высноў, прэзентаваных на старонках манаграфіі. Так, аналізуючы Купалаву «Паўлінку», П. Васючэнка прапанаваў адметную трактоўку галоўнай гераіні п’есы: «Маладая Беларусь – шматзначны вобраз. Маладосць Паўлінкі атаясамліваецца не толькі з маладым насельніцтвам Беларусі, але і з новымі, адраджэнскімі ідэямі, што запанавалі ў пэўным асяродку. Няўрымслівасць, самавітасць і самастойнасць Паўлінкі – паралеллю марам пра незалежнасць, годнасць, якія маглі б прывесці Маладую Беларусь да “пачэснага пасаду між народамі”» [2, с. 107]. Пасля аналізу ідэйнага зместу, паэтыкі Купалавай камедыі П. Васючэнка робіць выснову: «“Паўлінка” сведчыць: хараство й канцэптуальнасць купалаўскіх твораў значнай часткаю саваёй грунтаваліся якраз на тым “унутраным разладзе”, які палохаў, бянтэжыў самога паэта. Разлад, унутраная канфліктнасць, “адкрытасць”, уласцівая лепшым творам Купалы, – складаныя паэтыкі Купалы, ягонай паэтычнай і драматургічнай “мовы”» [2, с. 117]. П. Васючэнка раскрыў аб’ёмнасць і шматмернасць мастацкага свету Купалы-драматурга, паказаў складанасць аўтарскага мастацкага хранатопу, увасаблення ірацыянальнага, міфалагічнага, трансцэндэнтнага, вобразна-сімвалічнага вопыту ў філасофскім спазнанні сусвету і чалавека як часткі касмічнага цэлага. Ён адзначае: «Хранатоп Купалавага свету цураецца простых ліній, плоскасцяў; гэта мікракосм, пабудаваны ў сугуччы з найноўшымі ўяўленнямі пра прастору і час, дзе ўсё адноснае й рухомае, дзе няма раз і назаўжды прынятай высновы, дзе пануе супярэчлівая і заўжды нечаканая мастакоўская думка, дзе развіццё вобразаў, іх эвалюцыя рухаецца па складанай лініі – парабале» [2, с. 169]. Паводле П. Васючэнкі, Янка Купала востра бачыў трагічны разлад,

дысгармонію свету, засцерагаў грамадства і чалавецтва ад духоўнай катастрофы. Ідучы за Купалам-мысляром, яго філасофска-мастацкай думкай, даследчык зазначае: «Купалаўскі вобраз-сімвал хаты мае ў гэтым кантэксце яшчэ адно дадатковае значэнне: цёплыя сцены хаты (гістарычнага дому) надзейна ахоўваюць мову, культуру, духоўнае быццё нацыі ад наступу сусветнага ліха. Апошняе пагражае не толькі беларусам, але й кожнаму народу ў свеце» [2, с. 172]. Як можна пераканацца з манаграфіі П. Васючэнкі, Янка Купала – мастак глыбіннага нацыянальна-мастацкага светабачання і светаразумення, які звяртаўся да народна-паэтычнай вобразнай сімволікі, міфалагізму, касмагоніі, філосаф, думка якога набывала агульначалавечае вымярэнне, знаходзілася ў гуманістычнай, хрысціянскай у сваёй аснове, парадыгме.

У кнігах П. Васючэнкі «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм» (2004; 2-е выд. – 2016), «Ад тэксту да хранатопа» (2009), апрача іншага, таксама разглядаюцца купалаўскія драматычныя творы. Даследчык аналізуе праявы сімвалісцкага мыслення паэта і драматурга, выяўляе сутнасць яго ідэйна-духоўных і эстэтычных пошукаў.

Кніга «Сучасная беларуская драматургія» (2000) П. Васючэнкі выдадзена як дапаможнік для настаўнікаў, прытым вялікім на той час накладам – 9370 асобнікаў. Яна хутка разышлася і стала шырока запатрабаванай у навучальных установах. Рукапіс гэтай кнігі рэцэнзаваўся ў Навукова-метадычным цэнтры вучэбнай кнігі і сродкаў навучання, і мне давялося рыхтаваць экспертнае заключэнне (дарэчы, Пятро Васільевіч быў удзячны за падтрымку і парады, што адлюстравалася пазней у яго надпісе-аўтографе). Кніга гэта была надзвычай патрэбнай і чаканай настаўнікамі, студэнтамі, якія не мелі такога каштоўнага, кампактна выкладзенага літаратурна-крытычнага матэрыялу для вывучэння сучаснай беларускай драматургіі. П. Васючэнка, разглядаючы мастацкія дасягненні і набыткі ў рэчышчы традыцыйнай паэтыкі і эстэтыкі, выйшаў за межы школьнай праграмы, запыніўся на самых новых з’явах, тэндэнцыях драматургічнага і тэатральнага працэсу. У той жа час старэйшыя даследчыкі, як правіла, выказваліся досыць стрымана і без жадання падтрымліваць пошукі маладых. Нестандартнае, а то і парадаксальнае пры гаворцы пра найноўшую беларускую драматургію да П. Васючэнкі (праўда, тут яшчэ трэба назваць І. Шаблоўскую. Е. Лявонаву) калі і не абміналася, то не знаходзіла адпаведнага тлумачэння, асэнсавання. У гэтай сувязі ў дапаможніку вылучаецца раздзел «Эксперыментальная драматургія», дзе аўтар падрабязна запыніўся на творчасці драматургаў «новай хвалі», прааналізаваў адмысловыя тэкставыя структуры А. Асташонка, М. Арахоўскага, І. Сідарука, Г. Багданавай. Знайшлося месца і для разгляду нетыповай камедыйнай п’есы вядомага майстра драматургіі А. Дзялендзіка. Эксперыментальныя пошукі гэтых і некаторых іншых аўтараў у беларускай драматургіі канца ХХ ст. былі звязаны з эстэтычным досведам еўрапейскага «тэатра абсурду». П. Васючэнка добра ўсведамляў, што літаратурны эксперымент – заўсёды рызыка, але без пошуку новага маўлення, новых форм, абнаўлення творчых прыёмаў і стылістыкі не можа быць дынамікі, развіцця сучаснай п’есы. Ён, відавочна палемізуючы з уяўнымі апанентамі, зазначаў: «Можна рабіць шматлікія крытычныя заўвагі, але не трэба забывацца і пра тое, што творчая смеласць і рызыка самі па сабе з’яўляюцца неад’емнай часткай эстэтыкі» [5, с. 145]. Няхай сабе і не прыжылася драма абсурду на беларускай сцэне, але творчыя эксперыменты з формай, трансфармацыяй прыёмаў заходнееўрапейскай драмы на пэўным этапе былі свежымі павевамі новага, знаходзілі

водгук і розгалас, пашыралі рэпертуарныя рамкі, кампазіцыйна-выяўленчыя магчымасці і абсягі сцэнічнага мастацтва. Няма і не будзе эстэтычнага прагрэсу, крэатыўнага прарыву, сапраўднага «выбуху» цікавасці да тэатральнай пастаноўкі, сучаснай п'есы без яркага драматургічнага дзеяння, творчай смеласці пры ўвасабленні ўласнай задумы, жадання эксперыментаваць і здзіўляць публіку. П'еса ці сцэнічная пастаноўка твора мусіць стаць мастацкай з'явай, падзеяй. П. Васючэнка ўвесь час скіроўваў да пошуку і сінтэзу ў драматургічнай творчасці, і сам як пісьменнік шукаў найбольш адэкватныя формы, прыёмы, штосьці новае, а таму і ствараў па-сучаснаму цікавае і займальнае (напісаў арыгінальныя п'есы, адмысловыя казкі для дзяцей, фэнтэзі, раман-бурлеск). Ён меў рацыю: «Новае жыццё п'есы магчыма ва ўмовах спалучэння эксперыменту і традыцыі. Талент і майстэрства драматурга – якасці, без якіх такі сінтэз не можа адбыцца» [5, с. 157].

Свой вопыт знаўцы, даследчыка нацыянальнай драматургіі П. Васючэнка ўвасобіў і ў шэрагу іншых навучальных і навукова-папулярных выданняў, створаных у суаўтарстве: «Беларуская літаратура і свет» (2006), «Беларуская літаратура» (2009), «Словы ў часе» (2014). У названым дапаможніку для вучняў 11 класа «Беларуская літаратура» яму належыць раздзел «Аляксей Дудараў», а таксама ён зрабіў агляд беларускай драматургіі на сучасным этапе. Што цікава, аўтар не задавальняецца канстатацыяй здабыткаў і поспехаў на ніве драматургіі, а завастрае ўвагу на праблемах і актуальных задачах, якія яму былі добра вядомы і па ўласнай творчай дзейнасці: «Існуюць праблемы, ад вырашэння якіх істотна залежыць развіццё беларускай п'есы: складанне рэпертуару тэатраў, адносіны паміж драматургіяй і рэжысурай, публікацыя п'ес, рэцэнзаванне твораў, мова п'ес і спектакляў… Першы погляд на тэатральную афішу сталіцы сведчыць: нацыянальная драматургія пакуль не заняла ў ёй належнага месца» [1, с. 226]. П. Васючэнка не быў ціхім сузіральнікам ці фіксатарам фактаў, а, наадварот, ён паўстае ў іпастасі надзвычай кампетэнтнага эксперта-аналітыка, неабыякавага даследчыка і актыўнага ўдзельніка бягучага драматургічнага працэсу.

У творчым актыве П. Васючэнкі, літаратуразнаўца і крытыка, блізу 200 публікацый, шматлікія яго артыкулы прысвечаны гісторыі і сучаснаму стану беларускай драматургіі, канкрэтным творчым асобам. Выступаючы перыядычна ў друку, ён звяртаў увагу і надоўга запамінаўся выказанымі думкамі-развагамі. Сярод публікацый вылучым артыкулы «Загадкавыя "Тутэйшыя"» (1989), «Ад Буслая да Вітаўта» (1995), «Камедыя з сакрэтам» (2010), «Таямніца неўміручасці Крапівы» (2011) і інш. У артыкуле «Перакульваючы стэрэатыпы» (2010) пра А. Дударава ён пісаў: «Здавалася, у абліччы Аляксея Дударава маем драматурга-псіхолага, стваральніка вострасацыяльнай драмы. Але надыходзіць момант – і гэты стэрэатып перакульваецца. Бо новы Дудараў шукае новых герояў не на "зломе" сучаснага быцця, а ў галерэях гісторыі. І гістарычныя партрэты, намаляваныя драматургам, не супадаюць з іх вядомымі па гістарычных і літаратурных крыніцах арыгіналамі… Вядома, галоўнае ў гістарычных драмах Дударава – не эксперыменты з рэаліямі мінуўшчыны. А тое, што старыя беларускія летапісы і хронікі ажываюць на сцэне. Уладзімір Караткевіч калісьці белетрызаваў і рамантызаваў беларускую летапісную мінуўшчыну. Цяпер яна тэатралізуецца» [4, с. 1]. Меркаванне даследчыка цікавае з пункту гледжання інтэрпрэтацыі феномена Дударава-драматурга, ацэнкі яго як крэатыўнага майстра п'есы, які шукае новыя тэмы і вобразы, па-

мастацку ўзнаўляе і мадэрнізуе гісторыю. П. Васючэнка цудоўна разумеў спецыфіку драматургічнага мастацтва, сутнасць творчай працы мастака, уключанага думкай у тэатральную прастору (цытуем яго прадмову да зборніка «Сучасная беларуская драматургія: традыцыя і наватарства»): «Драматург стварае мрою, ілюзію, але гэта ілюзія такая жывая, выразная і пераканаўчая, што можа падацца больш рэальнай, чым само жыццё» [6, с. 3].

Пятро Васючэнка, даследчык і крытык, захапляе сваім аўтарскім бачаннем літаратурных з'яў і тэндэнцый. Бачанне гэта арыгінальнае, аб'ёмнае, кантэкстуальнае, а галоўнае, праніклівае і глыбокае. У тых выпадках, калі П. Васючэнка меў справу з высокамастацкім драматургічным матэрыялам, яго сучасным прачытаннем, трактоўкай, ён як даследчык выходзіў на філасофска-аналітычны ўзровень мыслення, дэманстраваў навуковымі штудыямі і тэкстамі інтэлектуальнае літаратуразнаўства. Сваёй думкай ён у аднолькавай ступені арганічна інтэграваўся як у айчынны, так і ў сусветны літаратурны кантэкст. П. Васючэнка паўстае як нацыянальны інтэлігент-думаннік, які ствараў беларускую інтэлектуальную прастору.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская літаратура: дапам. для вучняў 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.]; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 248 с.

2. *Васючэнка, П.* Драматургічная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка; АН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 173 с.

3. *Васючэнка, П. В.* Драматургія і час / П. В. Васючэнка; АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 143 с.

4. *Васючэнка, П.* Перакульваючы стэрэатыпы / П. Васючэнка // Літ. і мастацтва. – 2010. – 11 чэрв. – С. 1.

5. *Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 158 с.

6. Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства / уклад. і прадм. П. Васючэнкі. – Мінск : Сэр-Віт, 2003. – 639 с.